**Н. Наталевіч**

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР**

# Выбары ў Советы заходніх абласцей Беларускай ССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР на 15 снежня 1940 года назначаны выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях нашай рэспублікі.

Пасля выбараў у Вярхоўны Совет Саюза ССР і Вярхоўны Совет БССР—выбарамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у гэтых абласцях заканчваецца перабудова ўсіх органаў дзяржаўнай улады ў адпаведнасці з нормамі і патрабаваннямі Сталінскай Канстытуцыі.

Працоўныя заходніх абласцей Советскай Беларусі ўпершыню на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі будуць выбіраць сапраўды сваіх народных прадстаўнікоў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

### Буржуазная дэмакратыя—дэмакратыя для багатых

У былой Польшчы іспавалі выбары ў т. зв. абшчынныя, валасныя і павятовыя муніцыпалітэты.

Буржуазныя выбары ў муніцыпалітэты не могуць ісці ні ў якое параўнанне з выбарамі ў Советы дэпутатаў працоўных.

Буржуазія надае вельмі вялікае значэнне выбарам у муніцыпалітэты і гэтыя выбары абстаўляе так, каб у муніцыпалітэты прайшлі людзі маёмасных класаў, якія-б адлюстроўвалі інтарэсы буржуазіі.

У ліпені 1939 года польскімі ўладамі былі апублікаваны афіцыяльныя даныя аб выніках «выбараў» у гарадскія муніцыпалітэты. Удзельнічала ўсяго 63,6% выбаршчыкаў. Па многіх гарадах колькасць прымаўшых удзел у «выбарах» не дасягала і 30%. Грамадскасць гарадоў выносіла многа пратэстаў супроць фальсіфікацыі ў падліку галасоў, парушэння ўладамі выбарчага закона, які і без таго вельмі абмяжоўваў правы народных мас.

Між тым, гэта не перашкаджала польскай буржуазіі шумець наконт усеагульнасці выбарчага права і дэмакратычнасці выбараў.

Няма ні адной капіталістычнай краіны, кіруючыя класы якой выступілі-б і заявілі-б аб тым, што ў іх краіне няма дэмакратыі, што замест дэмакратыі квітнее сваявольства і гвалт буржуазіі над працоўнымі.

Наадварот, мы з'яўляемся сведкамі іншай практыкі. Правячыя класы капіталістычных краін са скуры лезуць, даказваючы, што ў іх краінах квітнее самая шырокая і поўная дэмакратыя, дэмакратыя для ўсіх.

Больш таго, буржуазія такіх дзяржаў, як Англія і Францыя, нават не супроць таго, каб шчыгальнуць, выступаючы ў ролі «абаронцаў дэмакратыі».

Так, англійскія і французскія капіталісты, маскіруючы свае імперыялістычныя мэты, аб'явілі вайну Германіі пад сцягам абароны дэмакратыі і праў малых народаў.

Гэтыя «абаронцы дэмакратыі» паставілі пад удар вайны цэлыя дзяржавы і падверглі незлічоным і цяжкім пакутам працоўнае насельніцтва, знішчаючы ў сваіх краінах нават мізэрныя рэшткі буржуазнай дэмакратыі.

Мітусня і шуміха, якую стварае і падтрымлівае буржуазія вакол буржуазнай дэмакратыі, вельмі напамінае вазню малпы з акулярамі з басні Крылова, якая: «То к темю их прижмет, то их на хвост нанижет, то их понюхает, то их полижет».

Неспрактыкаваны ў палітыцы чалавек пасля такой шуміхі гатоў думаць, што буржуазія так любіць дэмакратыю, што без яе і жыць не можа.

Але як-бы ні старалася, ні ўмудралася буржуазія выдаваць буржуазную дэмакратыю за дэмакратыю агульнанародную, буржуазная дэмакратыя застаецца дэмакратыяй для багатых, для буржуазіі, а не для працоўных.

Дэмакратыя ў літаральным сэнсе слова азначае—народаўладдзе. Дэмакратыя азначае такі палітычны лад, пры якім улада належыць народу і ажыццяўляецца самім народам, або яго прадстаўнікамі, адказнымі перад ім. Сапраўдная дэмакратыя магчыма толькі ва ўмовах совецкай дзяржавы.

Дзе яшчэ ёсць хоць адна ў свеце краіна, з ліку нават найбольш «дэмакратычных» буржуазных краін, у якой-бы працоўныя карысталіся такімі правамі, як правам свабодна арганізоўваць мітынгі і сходы, выказваць свае ідэі і абараняць свае інтарэсы, мець свае друкарні і друк, свабодна вылучаць прадстаўнікоў свайго класа да кіраўніцтва дзяржавай, вырашаць дзяржаўныя пытанні ў інтарэсах працоўных. Хіба ёсць такая буржуазная краіна, дзе-б зямля, фабрыкі, заводы лічыліся агульнанародным здабыткам і працоўныя свабодна імі ўладалі. Такой буржуазнай краіны няма.

Ва ўсіх, нават найбольш «дэмакратычных» буржуазных дзяржавах, улада, сродкі вытворчасці, зямля, заводы і фабрыкі належаць капіталістам і памешчыкам, а не народу, не працоўным. А раз палітычная ўлада і сродкі вытворчасці знаходзяцца ў руках нязначнай меншасці—класа эксплаатататараў, інтарэсы якога разыходзяцца з інтарэсамі большасці, з інтарэсамі народа, то гэта ўлада меншасці немінуча ператвараецца ў гвалт над большасцю.

Значыць, якімі-б формамі ні прыкрывалася рэспубліка, няхай яна будзе самая дэмакратычная, але раз у ёй застаецца прыватная ўласнасць на зямлю, заводы і фабрыкі, раз улада знаходзіцца ў руках эксплаатататараў, гэта рэспубліка ёсць буржуазная рэспубліка, буржуазная дзяржава, дзе дэмакратыя існуе толькі для багатых.

Аб дзяржаве буржуазнай рэспублікі Энгельс гаворыць так:

> «Дзяржава ёсць не што іншае, як машына для падаўлення аднаго класа другім, і ў дэмакратычнай рэспубліцы нікольк не менш, чым у манархіі».

Буржуазія выкарыстоўвае ўладу, дзяржаўную машыну не дзеля стварэння дэмакратычных прывілеяў для працоўных, а дзеля таго,

каб падаўляць і эксплаатаваць працоўных, умацоўваць панаванне капітала.

Ва ўмовах буржуазнай рэспублікі гутарка можа ісці не аб дэмакратыі наогул, а аб дэмакратыі для нязначнай меншасці, аб дэмакратыі для буржуазіі.

Дэмакратыі наогул не існавала і не існуе. Гісторыя ведае канкрэтныя прыклады толькі класавай дэмакратыі.

Так, у рабаўладальніцкім (антычным) грамадстве: рабаўладальнікі і рабы. Рабы не лічыліся за людзей і ніякіх правоў не мелі. Там дэмакратыя была толькі для рабаўладальнікаў.

У феадальным грамадстве: феадалы і прыгонныя сяляне. Апошнія, як і рабы, ніякіх правоў не мелі. І тут дэмакратыя была толькі для феадалаў.

У капіталістычным грамадстве: капіталісты—эксплаататары і пролетарыі—эксплуатуемыя. І пры капіталізме гутарка можа ісці аб дэмакратыі толькі для буржуазіі.

Ніякай размовы аб сапраўднай свабодзе і роўнасці, аб дэмакратыі для працоўных, нават ва ўмовах самай «дэмакратычнай» буржуазнай рэспублікі, і быць не можа.

Паўстае пытанне: чаму-ж буржуазія ашуквае народ, чаму яна скрывае буржуазны характар сучаснай дэмакратыі капіталістычных краін? Чаму яна свае буржуазныя інтарэсы выдае заўсёды за агульнанародныя?

> «Буржуазіі выгадна і неабходна скрываць ад народа **буржуазны** характар сучаснай дэмакратыі. Буржуазія вымушана крывадушнічаць і называць «агульнанароднаю уладай» або дэмакратыяй наогул, або чыстай дэмакратыяй (**буржуазную**) дэмакратычную рэспубліку, якая на справе прадстаўляе сабой дыктатуру буржуазіі, дыктатуру эксплуататараў над працоўнымі масамі» [1].

Буржуазіі заўсёды было выгадна выступаць у ролі «абаронцы» і «дабрадзея» усяго народа.

Хлуслівай балбатнёй аб дэмакратычнасці (а, значыць, і справядлівасці) капіталістычнага ладу буржуазія прабуе затуманіць вочы працоўным, прыкрыць несправядлівасць капіталістычных парадкаў.

Капіталісты ва ўласных інтарэсах арганізавалі другую імперыялістычную вайну, але яны заяўляюць аб тым, што гэта вайна вядзецца ў інтарэсах нацыі і дзяржавы, г. зн. у інтарэсах народа.

Развіваючы нацыяналізм і шавінізм сярод працоўных, буржуазія імкнецца ўкараніць у сазнанне працоўных думку аб тым, што ў іх ёсць радзіма, ёсць бацькаўшчына, каб у выпадку вайны працоўныя беспярэчна змагаліся за інтарэсы капіталізма.

Контррэволюцыйная сутнасць буржуазнай дэмакратыі ясна. Яна разлічана на тое, каб надзець буржуазную «вузду» на мазгі і свядомасць працоўных, трымаць іх у паслушэнстве пакорлівых рабоў, кіруючы імі так, як хочацца капіталістам. Яна разлічана на тое, каб скрыць ад працоўных паразітычную сутнасць капіталістычнага ладу, завуаляваць ўсе язвы капіталізма, даказаць агульнасць інтарэсаў паміж буржуазіяй і працоўнымі, прытупіць рэволюцыйную свядомасць і пільнасць рабочага класа.

---

[1] Ленін, т. XXIII, стар. 441.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Чаго варты буржуазныя канстытуцыі, якія рэкламіруюць фармальную роўнасць, калі на практыцы яна зводзіцца на нішто.

Буржуазныя канстытуцыі фармальна прадастаўляюць рабочаму права быць выбраным у парламент, але па той-жа буржуазнай канстытуцыі рабочы ніколі не выбіраецца, а выбіраецца буржуазія.

Рабочаму фармальна прадастаўляецца права ездзіць у каютах першага класа на параходзе, абедаць на залатым сервізе, але, як усім вядома, у каютах першага класа ён не ездзіць і на залатым сервізе не абедае, бо ў яго на гэта няма сродкаў.

Затое буржуазія поўнасцю выкарыстоўвае гэта права. У руках буржуазіі—улада. У яе распараджэнні ўся сіла дзяржаўнай машыны: армія, паліцыя, пракуратура, суды, цэрквы, школы. У яе распараджэнні ўсе сродкі вытворчасці: зямля, заводы, фабрыкі, друк.

Дзеля сваіх асабістых інтарэсаў, каб умацаваць панаванне капітала, буржуазія выкарыстоўвае ўсе пружыны дзяржаўнай машыны. Яна не грэбае нават такімі «сродкамі», як подкуп, абман, фальсіфікацыя, пагрозы, тэрор супроць працоўных, абы толькі працягнуць у парламент сваіх прадстаўнікоў. Ва ўсіх буржуазных краінах у парламенты выбіраюцца, як правіла, прадстаўнікі эксплаататарскіх класаў. Вось састаў англійскай палаты абшчын выбараў 1935 г.: капіталістаў-рант'е 306, памешчыкаў 27, адвакатаў, чыноўнікаў і асоб свабодных прафесій 74, рабочых і рамеснікаў 15.

Калі ўлічыць яшчэ наяўнасць двухпалатнай сістэмы буржуазных парламентаў і тое, што другая палата, як правіла, не выбіраецца, а назначаецца зверху (напрыклад, англійская палата лордаў цалкам складаецца з асоб, назначаных каралём; японская палата пэраў назначаецца імператарам; у польскі сенат 32 сенатары з 96 назначаліся прэзідэнтам, а астатнія адпаведным чынам падабранымі так званымі ваяводскімі выбарчымі калегіямі), то кожнаму стане ясна, што ўсе дзяржаўныя пытанні, гэтак сама як жыццё і лёс працоўных, вырашаюцца кучкай эксплаататараў у інтарэсах капіталізма.

Што-ж дае буржуазная дэмакратыя для працоўных? Якімі правамі карыстаюцца яны ва ўмовах буржуазнай рэспублікі?

Працоўным прадастаўляецца права «...раз у тры або шэсць год рашаць, які член пануючага класа павінен прадстаўляць і падаўляць народ у парламенце». Так метка вызначыў сутнасць буржуазнай дэмакратыі Маркс.

Працоўныя ва ўмовах капіталістычнага ладу карыстаюцца правам прадаваць сваю рабочую сілу і быць эксплаатуемымі, правам на беспрацоўе і галодную смерць, правам быць бітымі і пасаджанымі ў турму.

Гэтымі «правамі» буржуазія шчодра надзяляе працоўных.

Увесь цяжар другой імперыялістычнай вайны капіталісты перакладаюць на плечы працоўных. Ва ўсіх капіталістычных краінах у сувязі з вайной падоўжан працоўны дзень, узмоцнена эксплаатацыя працоўных, павялічаны падаткі.

Ваенныя мерапрыемствы англійскіх і французскіх капіталістаў накіраваны на тое, каб знішчыць нават рэшткі буржуазнай дэмакратыі, ліквідаваць парламенцка-дэмакратычныя метады кіраўніцтва.

Гэтым тлумачыцца той тэрор супроць комуністычнай партыі, супроць працоўных мас, які прымяняюць урады гэтых дзяржаў.

Буржуазная дэмакратыя, абараняючы інтарэсы эксплаататараў, узаконьвае рабунак і эксплаатацыю. Таму працоўныя капіталістычных

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

краін не могуць прызнаць буржуазнай дэмакратыі і вядуць барацьбу за яе знішчэнне, за знішчэнне капіталізма, за перамогу пролетарскай рэволюцыі.

**Социялістычная дэмакратыя—дэмакратыя для працоўных**

Социялістычная дэмакратыя карэнным чынам адрозніваецца ад дэмакратыі буржуазнай. Паміж імі такая-ж розніца, як паміж небам і зямлёю.

Ленін так вызначаў сутнасць социялістычнай дэмакратыі ў тым выглядзе, як яна склалася адразу пасля Кастрычніцкай рэволюцыі:

> «Социялістычны характар дэмакратызма Совецкага,—гэта значыць **пролетарскага,** у яго канкрэтным, даным, прымяненні,—заключаецца, па-першае, у тым, што выбаршчыкамі з'яўляюцца працоўныя і эксплуатуемыя масы, буржуазія выключаецца; па-другое, у тым, што ўсякія бюракратычныя фармальнасці і абмежаванні выбараў адпадаюць, масы самі вызначаюць парадак і тэрміны выбараў, пры поўнай свабодзе адклікання выбраных; па-трэцяе, што ствараецца найлепшая масавая арганізацыя авангарда працоўных, буйна-прамысловага пролетарыята, якая дазваляе яму кіраваць найбольш шырокімі масамі эксплуатуемых, уцягваць іх у самастойнае палітычнае жыццё, выхоўваць іх палітычна на іх уласным вопыце, што такім чынам упершыню робіцца прыступ да таго, каб сапраўды пагалоўна насельніцтва вучылася кіраваць і пачынала кіраваць»[1].

Социялістычная дэмакратыя забяспечвае грамадзянам СССР такія палітычныя правы і свабоды, якімі не карыстаюцца працоўныя ні адной капіталістычнай краіны, нават самай дэмакратычнай.

Неад'емныя дэмакратычныя правы грамадзян СССР вызначаны асноўным законам нашай краіны—Сталінскай Канстытуцыяй: права на працу, на адпачынак, на асвету, на забеспячэнне ў старасці, права выбіраць і быць выбраным у вышэйшыя органы дзяржаўнай улады.

Жанчыне прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай на ўсіх галінах дзяржаўнай дзейнасці. Роўнапраўе грамадзян СССР незалежна ад іх нацыянальнасці і расы з'яўляецца непарушным законам. За ўсімі грамадзянамі прызнаецца свабода сумлення і свабода антырэлігійнай прапаганды.

Сталінская Канстытуцыя ў інтарэсах умацавання социялістычнага грамадства гарантуе свабоду слова, друку, сходаў, мітынгаў, права аб'яднання ў грамадскія арганізацыі, недатыкальнасць асобы, недатыкальнасць жылля і тайну перапіскі, права прытулку замежным грамадзянам, якія праследуюцца за абарону інтарэсаў працоўных, або за навуковую дзейнасць, або за нацыянальна-вызваленчую барацьбу.

Усеагульнае, прамое, роўнае выбарчае права пры тайным галасаванні дазваляе кожнаму грамадзяніну нашай краіны з вычарпальнай паўнатою рэалізаваць свае дэмакратычныя правы.

Усё гэта гаворыць аб тым, што социялістычны дэмакратызм сапраўды з'яўляецца да канца вытрыманым, а, значыць, і поўным дэмакратызмам.

Сталінская Канстытуцыя разам з тым накладае на ўсіх грамадзян СССР сур'ёзныя абавязкі: выконваць законы, захоўваць дысцыпліну

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**